# ПРАДМОВА

Адным з паказчыкаў узроўню развіцця разумовых здольнасцяў чалавека лічаць багацце яго мовы, уменне творча і самастойна вырашаць пастаўленыя маўленчыя задачы.

Закладзеная традыцыя правядзення алімпіяды па вучэбных прадметах «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура» спрыяе развіццю таленавітай асобы і падтрымлівае цікавасць вучняў да вывучэння роднай мовы. Алімпіядны рух стварае ўмовы для фарміравання якасцяў асобы вучняў, неабходных для іх далейшай паспяховай сацыялізацыі ў сучасным грамадстве, дапамагае фарміраванню ў падрастаючага пакалення навыкаў творчага, самастойнага мыслення праз навучанне ў сітуацыях з высокім узроўнем невызначанасці.

На другой ступені навучання ў вучняў сфарміраваны ўменні ўзнаўляць засвоены матэрыял, працаваць па прапанаваным узоры, але не сфарміраваны ўменні самастойнага мыслення і падбору новых спосабаў рашэння пастаўленых задач. Заданні ў зборніку падабраны з мэтай фарміравання і развіцця моўных і маўленчых кампетэнцый вучняў, што вынікае з задач, якія сфармуляваны ў канцэпцыях вучэбных прадметаў «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура».

Зрабіць падрыхтоўку вучняў да алімпіяды больш паспяховай дапаможа прадстаўлены зборнік заданняў. У кнізе змешчаны заданні для арганізацыі і правядзення алімпіяд па беларускай мове і літаратуры для навучэнцаў 5 класаў агульнаадукацыйных школ, гімназій.

Дапаможнік уключае 10 комплексных работ для правядзення школьных, гарадскіх і раённых алімпіяд. Прапанаваны матэрыял ахоплівае наступныя раздзелы школьнага курсу беларускай мовы: фанетыка, арфаэпія, лексіка, фразеалогія, марфалогія, арфаграфія, сінтаксіс і пунктуацыя.

Парадак размяшчэння матэрыялу адпавядае практыцы складання алімпіядных комплексных работ. Традыцыйна ў якасці апошніх заданняў прапанаваны пытанні на веданне тэкстаў мастацкай літаратуры, жыццёвага і творчага шляху пісьменнікаў і паэтаў, а таксама пытанні па тэорыі літаратуры.

У дапамогу настаўніку да ўсіх заданняў прапанаваны разгорнутыя адказы і рэкамендацыі па іх праверцы, крыніцай якіх сталі ўказаныя ў канцы зборніка дапаможнікі і слоўнікі, што дазваляе выкарыстоўваць выданне для самастойнай працы пры падрыхтоўцы да алімпіяды.

Мэтанакіраваная і сістэмная работа па падрыхтоўцы да алімпіяды дапаможа развіццю лагічнага мыслення, выпрацоўцы спосабаў навучальнай дзейнасці, неабходных для асэнсавання законаў роднай мовы, выяўлення значэння, формы выражэння і функцый моўных адзінак.

Зборнік алімпіядных заданняў дапаможа настаўнікам і іх выхаванцам з поспехам падрыхтавацца да алімпіяды.

Жадаем поспехаў!

# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА 1

*(Максімальны бал — 50)*

**1.** Выпішыце словы, у якіх ёсць гук [дз’]. (*5 балаў*)

Малацьбіт, лебедзь, дзявяты, падземны, жаніцьба, дзверы, падземны, медзь, дзвесце, падзелены, падзорны, падзьмуць, падзываць, раздзяліць, падзяка, падзьмуць.

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

**2.** Устаўце, дзе трэба, прапушчаныя літары. (*9 балаў*)

Адр..сат, м..дзв..дзяня, л..генда, в..ранда, ц..мент, ж..мчужына, ч..р..паха, п..нал, майст..р, шніц..ль, ш..раваты, д..лікатны, х..рактар, прынт..р, в..траны, г..рой, ш..лясцець, к..фір.

**3.** З прапанаваных слоў адзначце адушаўлёныя назоўнікі. (*3 балы*)

- ☐ Дзядуля;
- ☐ валет;
- ☐ папугай;
- ☐ сірока;
- ☐ лялька;
- ☐ робат;
- ☐ вадзянік;
- ☐ група.

**4.** Перакладзіце тэкст на беларускую мову. (*7 балаў*)

Иное интересовало Петьку. Например, он часто представлял, как однажды откроются двери, станет в пороге отец, усталый, весёлый, с большим мешком денег за плечами, и тогда они начнут переезд — как в фильмах про новосёлов или на картинках в книге: грузовая машина с откинутым бортом, на ней вазон с фикусом, диван и полосатый кот на руках мальчика или радосной девочки (*По А. Федоренко*).

______________________________________________

______________________________________________

• Складзіце сказы з беларускімі адпаведнікамі выдзеленых слоў ***Петька, отец, мальчик и девочка*** так, каб у адным выпадку яны былі дзейнікамі, а ў другім — звароткамі. Запішыце.

**5.** З прапанаванымі амонімамі складзіце словазлучэнні, каб паказаць іх рознае лексічнае значэнне. (*5 балаў*)

У з о р : *нота соль — марская соль.*

1) Міна — міна;
2) блок — блок;
3) тры — тры;
4) фокус — фокус;
5) нота — нота.

**6.** Запішыце беларускія адпаведнікі да запазычаных слоў. (*5 балаў*)

Чэмпіён — ______________________________;

лозунг — ________________________________;

лідар — __________________________________;

кантраст — ______________________________;

тэмп — __________________________________;

каментарый — ___________________________;

рэзалюцыя — ____________________________;

дэкада — ________________________________;

аргумент — ______________________________;

гіпербала — _____________________________.

**7.** Укажыце слова, якое прапушчана ва ўсіх прапанаваных выразах. Запішыце значэнне ўсіх атрыманых фразеалагізмаў. (*5 балаў*)

1) Аддаваць ____________________ — ____________________

______________________________________________________;

2) адкрываць ____________________ — __________________

______________________________________________________;

3) адлягло ад ____________________ — __________________

______________________________________________________;

4) ад чыстага ____________________ — __________________

______________________________________________________;

5) ____________________ не ляжыць — __________________

______________________________________________________.

# СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

**1.** *Даніловіч, М. А.* Вывучэнне фразеалогіі на ўроках мовы : дапаможнік для настаўніка / М. А. Даніловіч. — Мінск : Народная асвета, 1991. — 94 с. — (Бібліятэка настаўніка беларускай мовы і літаратуры.)

**2.** *Дарган, Н. У.* Літаратура ў пытаннях і адказах / Н. У. Дарган. — Мінск : Беларуская асацыяцыя «Конкурс», 2017. — 223 с.

**3.** *Лепешаў, І. Я.* Слоўнік беларускіх прыказак : больш за 1600 прыказак / І. Я. Лепешаў, М. А. Якалцэвіч. — 3-е выд. — Мінск : Беларуская асацыяцыя «Конкурс», 2006. — 542 с.

**4.** *Лепешаў, І. Я.* Слоўнік фразеалагізмаў беларускай мовы : каля 7000 фразеалагізмаў. У 2 т. Т. 1 : А — Л / І. Я. Лепешаў. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 2008. — 669 с.

**5.** *Лепешаў, І. Я.* Слоўнік фразеалагізмаў беларускай мовы : каля 7000 фразеалагізмаў. У 2 т. Т. 2 : М — Я / І. Я. Лепешаў. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 2008. — 702 с.

**6.** *Сіўковіч, В. М.* Слоўнік беларускай мовы : арфаграфія, націск, словазмяненне, стылістычныя паметы : звыш 40 000 слоў / В. М. Сіўковіч. — Мінск : Аверсэв, 2012. — 640 с.

**7.** Слоўнік беларускай мовы. Арфаграфія. Арфаэпія. Акцэнтуацыя. Словазмяненне / Акадэмія навук БССР; Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа ; пад рэд. М. В. Бірылы. — Мінск : БелСЭ, 1987. — 902 с.

**8.** Слоўнік лексічных формаў : сінонімы, амонімы, антонімы, паронімы, амографы, амафоны / уклад. Я. І. Хвалей, У. В. Шарпіла. — Мінск : Paradox, 2004. — 415 с. — (Эрудыт.)

**9.** Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы : Больш за 65 000 слоў / Акад. навук Беларусі; Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа ; пад рэд. М. Р. Судніка і М. Н. Крыўко. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 1996. — 783 с.

# ЗМЕСТ

*Прадмова* . . . . . 1
КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА 1 . . . . . 3
КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА 2 . . . . . 8
КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА 3 . . . . . 12
КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА 4 . . . . . 17
КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА 5 . . . . . 22
КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА 6 . . . . . 27
КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА 7 . . . . . 31
КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА 8 . . . . . 35
КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА 9 . . . . . 40
КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА 10 . . . . . 44
АДКАЗЫ . . . . . 49
Комплексная работа 1 . . . . . 49
Комплексная работа 2 . . . . . 51
Комплексная работа 3 . . . . . 53
Комплексная работа 4 . . . . . 55
Комплексная работа 5 . . . . . 57
Комплексная работа 6 . . . . . 59
Комплексная работа 7 . . . . . 61
Комплексная работа 8 . . . . . 63
Комплексная работа 9 . . . . . 65
Комплексная работа 10 . . . . . 67
*Спіс выкарыстаных крыніц* . . . . . 70